Уладзімір ПАДАЛІНСКІ

# Персанальны склад і дзейнасць дэлегацыі Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 г.

*1 ліпеня 1569 г. у Любліне паны-рада і земскія паслы Польскага Каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага сваёй прысягай зацвердзілі акт уніі паміж дзвюма дзяржавамі. Аднак унійны дагавор не вырашыў усіх прынцыпова важных для станаўлення новага дзяржаўнага аб'яднання праблем, і пасяджэнні Люблінскага сойма працягваліся яшчэ да 12 жніўня 1569 г. Шмат у чым, менавіта ў ліпені–жніўні 1569 г. акрэсліваліся тыя шляхі, па якіх адбывалася далейшае гістарычнае развіццё Рэчы Паспалітай і народаў, аб'яднаных у яе складзе, у тым ліку і беларускага.*

Заключэнне ў 1569 г. Люблінскай уніі даўно стала аб'ектам пільнай увагі гісторыкаў розных краін. Яны падрабязна даследавалі самыя разнастайныя аспекты саюза, палітычную барацьбу вакол яго заключэння, прычыны і падрыхтоўку, сутнасць, умовы і вынікі. Вывучалася і ўласна праца супольнага сойма ў Любліне, які распачаўся 10 студзеня 1569 г. Праўда, галоўным чынам разглядаліся падзеі на сойме і вакол яго непасрэдна да заключэння уніі 1 ліпеня. Затое ход пасяджэнняў з 2 ліпеня па 12 жніўня 1569 г. апісваўся даволі агульна. Хаця, па сутнасці, у гэты час у Любліне адбываўся першы вальны сойм Рэчы Паспалітай[1].

У адзінкавых працах расійскіх і польскіх гісторыкаў звярталася ўвага толькі на ключавыя моманты і галоўныя вынікі працы сойма. Аднак спектр праблем, узнятых у Любліне ўжо пасля падпісання уніі, быў куды большы і закранаў амаль усе сферы жыцця тагачаснага шляхецкага грамадства Княства і Кароны. Удзел сенатараў і земскіх паслоў ВКЛ у вырашэнні гэтых праблем фактычна застаўся па-за ўвагай даследчыкаў. Яшчэ адным важным накірункам даследавання, які зусім не разглядаўся гісторыкамі, з'яўляецца вывучэнне персанальны склад прадстаўніцтва ВКЛ* на сойме ў Любліне ў ліпені—жніўні 1569 г. Сенатары і земскія паслы мелі свае інтарэсы, патрэбы, уяўленні, нормы паводзін, адметную свядомасць і каштоўнасці. Усё гэта непасрэдна ўплывала на іх соймавую дзейнасць. Таму без аналізу асабовага складу прадстаўніцтва немагчыма адэкватна даследаваць і разумець працу дэлегацыі ВКЛ на сойме 1569 г. Такім чынам, мэтай нашага даследавання стаў комплексны аналіз дзейнасці і асабовага складу дэлегацыі ВКЛ на першым вальным сойме Рэчы Паспалітай[2].

Дзейнасць прадстаўніцтва Княства на сойме ў Любліне ўлетку 1569 г. мела тры галоўныя накірункі: вызначэнне дзяржаўна-прававога статусу ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай, забеспячэнне сумеснай абароны ад агрэсіі Маскоўскай дзяржавы і вырашэнне мясцовых ды персанальных спраў.

* Пад тэрмінам "прадстаўніцтва ВКЛ" разумеем як земскіх паслоў, абраных ад шляхецкіх карпарацый паветаў і ваяводстваў ВКЛ, так і сенатараў, якія ўваходзілі ў склад верхняй палаты сойма паводле займаемых пасадаў і нікім непасрэдна не абіраліся.



***ПАДАЛІНСКІ Уладзімір Аляксеевіч.***

*Загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1978 г. у Шчучыне (Гродзенская вобласць). У 2000 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 2003 г. — аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі. У 2004 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Прадстаўніцтва і палітычная пазіцыя Вялікага Княства Літоўскага на вальных соймах Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVI ст.". З 2004 г. працаваў у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, з 2013 г. — у БДУ. Аўтар больш за 70 навуковых і вучэбна-метадычных публікацый, у тым ліку манаграфіі "Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года. Удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай" (Мінск, 2017).*

## Вызначэнне дзяржаўна-прававога статусу ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай

Утварэнне на федэратыўнай аснове Рэчы Паспалітай абумовіла з'яўленне агульных для Кароны і Княства ўладных інстытутаў і сфер грамадскіх адносін. Адпаведна паўставала неабходнасць вызначэння прынцыпаў працы супольнага сойма, размежавання паўнамоцтваў земскіх і прыдворных урадаў, збліжэння сістэм заканадаўства суб'ектаў Рэчы Паспалітай, уніфікацыі іх манетных сістэм. Важнае значэнне мела ўдакладненне прававога статусу тых зямель, што знаходзіліся ў рознай ступені залежнасці ад Кароны і Княства (Прускае герцагства, Інфлянты ў шырокім сэнсе, г.зн. герцагства Курляндскае і Земгальскае ды Задзвінскае княства), урэгуляванне тэрытарыяльных спрэчак уласна паміж Польскім Каралеўствам і ВКЛ.

Акт уніі прадугледжваў утварэнне ў Рэчы Паспалітай агульнага вальнага сойма, у якім павінны былі засядаць сенатары і земскія паслы Кароны і Княства ды разам раіцца аб супольных патрэбах. Пазней месцам яго правядзення вызначалася Варшава. У пачатку ліпеня быў ухвалены парадак на сойме вялікакняжацкіх і каронных сенатараў ды земскіх паслоў, які з невялікімі зменамі праіснаваў да канца XVIII ст. Адзначым, што на 1569 г. са 140 сенатараў Рэчы Паспалітай толькі 27 (19,3%) прадстаўлялі ВКЛ. У склад ніжняй палаты сойма разам са 124 кароннымі і прускімі пасламі ўвайшлі 44 земскія паслы (26,2%) ад 22 соймікавых акругаў ВКЛ[3]. Колькасна каронныя сенатары і паслы мелі значную перавагу над велікакняжацкімі. Аднак падкрэслім, што ў 1560-я гг. усталявалася практыка прыняцця соймавых рашэнняў шляхам дасягнення згоды паміж манархам, сенатам і пасольскай ізбой. Дасягнутая згода магла быць толькі пры ўмове падтрымкі той ці іншай ухвалы большасцю ўдзельнікаў сойма, без рашучага пярэчання з боку яе праціўнікаў[4]. Таму колькасная перавага прадстаўнікоў кароны не мела вызначальнага значэння, а дэлегацыя Княства заўсёды магла заблакаваць прыняцце некарысных для сябе пастаноў, тым больш, калі ўхвала магла датычыць непасрэдна ВКЛ.

Затое вызначэнне асабовага складу сената Рэчы Паспалітай стала балючым ударам па сацыяльным статусе часткі палітычнай эліты ВКЛ*. У супольным сенаце былі прадстаўлены толькі тыя ўрады Княства, якія мелі непасрэдныя адпаведнікі ў Кароне: каталіцкія біскупы, ваяводы (у тым ліку жамойцкі староста), кашталяны, земскі маршалак, канцлер, падканцлер, земскі падскарбі і дворны маршалак. У выніку, па-за яго межамі апынуўся шэраг дворных ураднікаў (дворны падскарбі, падчашы, крайчы, стольнік і інш.), гаспадарскія маршалкі, якія раней уваходзілі ў склад паноў-рады ВКЛ. Не атрымалі месца ў сенаце і нашчадкі вялікага князя Альгерда — слуцкія князі Алелькавічы. Перасталі запрашацца на сойм прадстаўнікі княжацкіх і панскіх родаў Княства[5]. Нагадаем, што напярэдадні Люблінскай уніі ад ВКЛ адышлі да Кароны адразу 4 ваяводствы: Кіеўскае, Валынскае, Падляшскае і Брацлаўскае.

У акце уніі 1 ліпеня 1569 г. гарантавалася захаванне ў ВКЛ усіх урадаў і іх кампетэнцыі[6]. Аднак утварэнне Рэчы Паспалітай востра ставіла пытанне аб размежаванні паўнамоцтваў земскіх і дворных ураднікаў Княства і Кароны, як падчас правядзення сеймаў, так і на каралеўскім двары. На сойме ў Любліне разгарэлася спрэчка паміж вялікакняжацкімі і кароннымі маршалкамі, якая датычылася не проста ўрэгулявання працэдурных пытанняў, але закранала праблему роўнага статусу Княства і Кароны ў складзе Рэчы Паспалітай.

Пасля працяглых дыскусій кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст 19 ліпеня 1569 г. выдаў прывілей, які часова рэгуляваў паўнамоцтвы земскіх і дворных маршалкаў[7]. У дакуменце абвяшчалася "злучэнне" паўнамоцтваў маршалкаў Кароны і Княства, "*як людзей і ўраднікаў каронных*", што фармальна павінна было гарантаваць іх раўнапраўе. Прыняцце больш дакладнай ухвалы аб урэгуляванні кампетэнцыі маршалкоўскіх урадаў адкладалася да наступнага вальнага сойма. Аднак наступны сойм 1570 г., з-за пратэстаў каронных ураднікаў, аніякай пастановы па гэтым пытанні прыняць не змог. Канчаткова размежавалі паўнамоцтвы маршалкаў толькі прывілеі Жыгімонта Аўгуста ад 15 красавіка 1572 г. і Уладзіслава Вазы ад 21 мая 1647 г.[8]

У цэлым, рашэнне па размежаванні кампетэнцыі маршалкаў павінна было яшчэ раз пацвердзіць захаванне ўсіх правоў і прывілеяў ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Аднак у працэсе падрыхтоўкі да заключэння уніі Жыгімонт Аўгуст выдаў два прынцыпова важныя дакументы, якія маглі паставіць пад сумненне фармальную роўнасць Кароны і Княства. Так, 13 сакавіка 1564 г. ён перадаў Кароне свае спадчынныя (дзедзічныя) правы на Княства, а 24 сакавіка 1569 г. зацвердзіў каронны варыянт умоў будучай уніі, абвінаваціўшы пры гэтым вялікакняжацкі бок у парушэнні старадаўніх унійных дамоў. Адзначым, што абодва дакументы былі выдадзеныя манархам у адсутнасці прадстаўнікоў ВКЛ[9]. Каб папярэдзіць магчымыя негатыўныя наступствы гэтых актаў для Княства, жамойцкі староста, земскі маршалак Ян Хадкевіч яшчэ 28 чэрвеня 1569 г. прасіў Жыгімонта Аўгуста афіцыйна дэкляраваць, што ўсе яго захады па заключэнні уніі адбываліся дзеля карысці ВКЛ і без абразы сумлення

* Паняцце "*палітычная эліта*" азначае групу асобаў, якія займалі вышэйшыя дзяржаўныя ўрады і/або мелі высокі сацыяльны статус, валодалі аўтарытэтам (прэстыжам) у грамадстве, і так ці інакш удзельнічалі ў прыняцці рашэнняў у агульнадзяржаўным маштабе. Фармальна, перад заключэннем Люблінскай уніі 1569 г. палітычная эліта ВКЛ адпавядала панам-радзе ў шырокім складзе.

яго абываценляў[10]. І вялікакняжацкая дэлегацыя ў Любліне здолела атрымаць ад манарха падобную пісьмовую дэкларацыю: 29 ліпеня 1569 г. Жыгімонт Аўгуст "*па просьбе рад і іншых станаў Вялікага Княства Літоўскага*" выдаў прывілей, якім абвяшчаў, што акты 1564 і 1569 гг. аніяк не могуць абмяжоўваць правоў і вольнасцей ВКЛ[11]. Такім чынам, прывілеі 19 і 29 ліпеня яшчэ раз падкрэслівалі раўнапраўны дзяржаўнаправавы статус Княства і Кароны ды іх абываценляў у складзе Рэчы Паспалітай.

Утварэнне "*адзінага і непадзельнага цела*" Рэчы Паспалітай таксама вымагала ўніфікацыі прававых сістэм Княства і Кароны. На сойме каронныя паслы прапанавалі абраць спецыяльных дэпутатаў, якія б уважліва перапрацавалі Статут ВКЛ 1566 г. ды выправілі ўсе "*супярэчнасці*" паміж каронным і вялікакняжацкім правам[12]. Відавочна, што ў дадзеным выпадку паправа Статута павінна была прывесці да збліжэння сістэм заканадаўства Кароны і Княства. Разам з тым, яго перапрацоўка з'яўлялася актуальнай справай і для самой дэлегацыі Княства. Ужо на сойме ў Гародні ў 1568 г. "*на поправенье статуту*" станы ВКЛ стварылі адмысловую камісію, якая павінна была прыступіць да працы ў Вільні ў жніўні таго ж года[13], але так і не сабралася. У выніку на сойме была прынята канстытуцыя аб стварэнні новай камісіі па рэдагаванні Статута ВКЛ 1566 г., якая мусіла ўзгадніць яго з каронным Статутам 1506 г., каб "*ужо ва ўсіх дзяржавах Нашых, як у адзінай Рэчы Паспалітай, аднолькавая і неадкладная справядлівасць людзям ажыццяўляцца магла".* Прадставіць вынікі працы неабходна было на наступным сойме. Са згоды "*ўсіх станаў Вялікага Княства Літоўскага*" быў зацверджаны і асабовы склад камісіі, у якую ўвайшлі як сенатары, так і прадстаўнікі шляхты. Пры гэтым, камісія была сфарміравана выключна з абываценляў Княства[14]. Дадзеная канстытуцыя адлюстроўвала імкненне кароннага боку да уніфікацыі права двух суб'ектаў Рэчы Паспалітай. Аднак праца па рэдагаванні Статута ВКЛ пайшла па шляху захавання асобнай прававой сістэмы Княства. У студзені 1588 г., новы кароль і вялікі князь Жыгімонт Ваза зацвердзіў трэці Статут ВКЛ, які замацаваў унутраную самастойнасць ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай[15]. Заўважым таксама, што разгляд шэрагу пытанняў, вельмі важных для далейшага развіцця Рэчы Паспалітай, такіх як парадак абрання новага караля і вялікага князя, рэформа судаводства або стварэнне адзінай манетнай сістэмы, быў перанесены на пазнейшы час.

Новыя палітычныя і прававыя ўмовы, што склаліся пасля заключэння Люблінскай уніі, выклікалі неабходнасць удакладніць статус некаторых залежных ад Кароны і Княства зямель. Пасля прысягі герцага Альбрэхта Фрыдэрыка Гогенцолерна 19 ліпеня 1569 г. Прускае герцагства апынулася ў васальнай залежнасці ўжо ад усёй Рэчы Паспалітай, а не толькі ад Польшчы[16]. На разгляд сойма ў Любліне выносілася пытанне аб прысязе прадстаўнікоў Інфлянтаў (т.зв. Задзвінскага княства) каралю і Польскаму Каралеўству, г.зн. аб далучэнні гэтай правінцыі да уніі Кароны і Княства. Вялікакняжацкая дэлегацыя настойвала, каб Інфлянты ўвайшлі ў склад Рэчы Паспалітай як неад'емная частка ВКЛ. Гэта аргументавалася тым, што паводле ранейшых дамоў, зацверджаных вялікім князем літоўскім і соймам (перш за ўсё, меліся на ўвазе дамова паміж Інфлянцкім ордэнам і ВКЛ ад 28 лістапада 1561 г., а таксама унія Інфлянтаў з ВКЛ, заключаная на сойме ў Гародні ў снежні 1566 г.), правінцыя ўжо была часткай Княства. Таксама падкрэслівалася, што ўвесь цяжар абароны Інфлянтаў ляжаў на вялікакняжацкім скарбе, і кампенсацыяй за панесеныя выдаткі павінна было быць далучэнне правінцыі да ВКЛ. З іншага боку, для польскіх сенатараў і паслоў заключэнне уніі паміж Каронай і Княствам адкрывала зусім новую старонку і ў гісторыі правінцыі. Правы Кароны на валоданне Інфлянтамі тлумачыліся неабходнасцю ўжо супольнай абароны правінцыі, яе прыналежнасцю польскаму каралю, а таксама самім фактам аб'яднання Княства і Кароны. Палякі абапіраліся на пастанову (рэцэс) кароннага сойма 1564 г. у Парчаве, які вызначыў прыналежнасць правінцыі як да Кароны, так і да Княства[17].

Пасля ўпартых спрэчак прадстаўнікі абодвух бакоў згадзіліся з тым, што Інфлянты будуць кандамініумам (супольным уладаннем) Польшчы і ВКЛ, а далейшае ўладкаванне правінцыі адкладалася на наступны вальны сойм[18]. Прысутныя ў Любліне прадстаўнікі Інфлянтаў 6 жніўня 1569 г. прысягнулі на вернасць каралю і Кароне. Яшчэ раней быў вызначаны статус герцагства Курляндскага і Земгальскага. Паводле каралеўскага прывілея ад 3 жніўня 1569 г. герцагства пераходзіла ў падвойную васальную залежнасць ад Кароны і Княства[19]. Такім чынам, вялікакняжацкая дэлегацыя ў Любліне не здолела захаваць Інфлянты выключна ў складзе ВКЛ. Аднак далейшае вызначэнне прававога статусу і адміністрацыйнага ладу правінцыі, значная частка якой была яшчэ акупаваная маскоўскай дзяржавай, было адкладзена. І гэта давала палітычнаму народу Княства* шанец вырашыць "інфлянцкае пытанне" згодна са сваімі інтарэсамі. Барацьба за прыналежнасць правінцыі зацягнулася на 20 гадоў. Толькі на сойме 1589 г. былі прыняты канстытуцыі, якія канчаткова вызначылі, што Інфлянты, згодна з рашэннямі сойма 1569 г., пераходзяць у супольнае падпарадкаванне ВКЛ і Польшчы[20].

Для далейшага суіснавання двух суб'ектаў Рэчы Паспалітай важнае значэнне мела ўрэгуляванне тэрытарыяльных спрэчак паміж імі. Для палітычнага

* Пад тэрмінам "палітычны народ" ВКЛ разумеем тую частку шляхты, якая актыўна карысталася правам удзельнічаць у палітычным жыцці на ўсіх яго ўзроўнях.

народа ВКЛ, у першую чаргу, справа ішла аб вяртанні адарваных у сакавіку—чэрвені 1569 г. Жыгімонтам Аўгустам зямель Падляшша і Украіны. Уздымаць пытанне аб вяртанні гэтых зямель на пасяджэннях сената або пасольскай ізбы было бесперспектыўна — каронны бок займаў тут адназначную пазіцыю. Нельга было спадзявацца і на падтрымку тых прадстаўнікоў адарваных зямель, якія ўжо прысягнулі на вернасць Кароне. Таму дэлегацыя ВКЛ спрабавала ўплываць менавіта на пазіцыю гаспадара. У просьбах, пададзеных Жыгімонту Аўгусту напрыканцы сойма, адзін з артыкулаў датычыўся магчымасці вяртання ў склад ВКЛ зямель Валыні і Падляшша, але адказ гаспадара быў адназначны: "*вжо не есть потреба того вспоминати*"[21]. 11 жніўня 1569 г. Жыгімонт Аўгуст выдаў акт пацвярджэння уніі, другі артыкул якога на "*вечныя часы*" зацвярджаў далучэнне да Кароны зямель Валыні, Кіеўшчыны і Падляшша[22]. Затое ўдалося захаваць за ВКЛ Мазырскі павет. Нагадаем, што Кіеўскае ваяводства, якое складалася з Кіеўскага і Мазырскага паветаў, было далучана да Кароны 6 чэрвеня 1569 г. Аднак у акце уніі Мазырскі павет фігураваў як частка Княства: мазырскія паслы прысягнулі менавіта як прадстаўнікі ВКЛ. Вялікакняжацкай дэлегацыі неабходна было юрыдычна замацаваць такі статус павета. І пры безумоўным удзеле прадстаўніцтва ВКЛ у соймавыя канстытуцыі было ўнесена рашэнне аб уключэнні Мазырскага павета ў склад Менскага ваяводства[23].

### Забеспячэнне абароны краіны

У дзейнасці дэлегацыі ВКЛ на сойме ў Любліне адно з цэнтральных месцаў займала вырашэнне цэлага блоку пытанняў, звязаных з арганізацыяй абароны краіны. Папярэдні вопыт Інфлянцкай вайны[24] паказаў, што Княства адно, без сур'ёзнай дапамогі з боку Кароны, не ў стане кардынальна змяніць ход вайны з Маскоўскай дзяржавай на сваю карысць. Менавіта неабходнасць пастаяннай знешняй падтрымкі была галоўнай прычынай, якая штурхала палітычны народ Княства да дзяржаўнага саюза з Каронай. Падобныя настроі падтрымліваліся і манархам.

Аднак надзеі на тое, што з заключэннем уніі адразу адбудуцца кардынальныя змены ў забеспячэнні абароны ВКЛ ад маскоўскай агрэсіі не спраўдзіліся. Соймавая дыскусія аб арганізацыі супольнай абароны паказала, што на той момант ні кароль, ні палітычныя народы Кароны і Княства не былі гатовыя да новых і рашучых крокаў, каб пераламіць ход Інфлянцкай вайны. Польскія сенатары прапаноўвалі выдаткоўваць частку грошай з кароннага скарбу на ўтрыманне пэўнай колькасці жаўнераў у памежных замках ВКЛ для забеспячэння аховы ўсходняй мяжы. Вялікакняжацкія сенатары канкрэтных ідэй як усё ж арганізаваць супольную абарону не выказвалі. Па сутнасці ўся дыскусія звялася да пытання, ці склікаць паспалітае рушэнне, ці ўхваляць новы падатак на найм жаўнераў для абароны межаў ВКЛ. А вось выказаная Жыгімонтам Аўгустам ідэя заснавання дзяржаўнага скарба, з даходаў якога можна было б утрымліваць пастаяннае войска, фактычна і не абмяркоўвалася[25].

Сенатары Кароны і Княства, як правіла, выказваліся супраць склікання шляхецкага апалчэння, якое, на іх думку, магло б прынесці больш шкоды самой Рэчы Паспалітай, чым яе ворагам. Адпаведна, яны схіляліся да ідэі найму войска, а значыць і ўхвалення новых падаткаў. У сваю чаргу, земскія прадстаўнікі ВКЛ адмаўляліся ад найманага войска ды выступалі за супольнае з Каронай паспалітае рушэнне[26]. Такая іх пазіцыя была абумоўлена тым, што шляхта Княства, асабліва дробная і сярэдняя, была ўжо знясілена шматлікімі папярэднімі паборамі. На працягу 1559—1568 гг. фактычна на кожным сойме ВКЛ ухваляліся ўсё новыя падаткі. У параўнанні з 1530—1540-мі гг. падатковы цяжар у 1560-я гг. павялічыўся ў 5—6 разоў. Акрамя таго, шляхта перыядычна асабіста мусіла выходзіць у паспалітае рушэнне, а яе маёнткі моцна цярпелі ад пастояў жаўнераў[27].

Відавочна, што земскія прадстаўнікі ВКЛ імкнуліся зменшыць фінансавы цяжар, які несла павятовая шляхта ўвесь час вайны. Паслы не толькі ўхіляліся ад ухвалення новых падаткаў, але й спрабавалі дабіцца скасавання старых, напрыклад, мытных пошлін на тавары экспарту і імпарту, а таксама падатку на памол хлеба і выраб алкагольных напояў, зацверджаных соймамі ВКЛ 1561 і 1566 гг. Былі спадзяванні перакласці пэўную частку выдаткаў па абароне, у тым ліку па ўтрыманні пастаяннага войска, на гаспадарскі скарб[28]. Хаця, заўважым, той і так нёс значную нагрузку па фінансавым забеспячэнні баявых дзеянняў. Аднак цвёрдая пазіцыя Жыгімонта Аўгуста і сенатараў ВКЛ вымусіла земскіх паслоў адступіць ад сваіх патрабаванняў і прыступіць да абмеркавання ўмоў выплаты новага падатку. У выніку, на патрэбы абароны Рэчы Паспалітай ухваляліся ланавы падатак па стаўцы 20 грошай польскіх з лана або валокі, шосавае з продажу сельскагаспадарчай прадукцыі і рамесных вырабаў, чопавае з вырабу і рэалізацыі алкаголю ды пагалоўны падатак з яўрэяў[29]. Заўважым, што стаўка новага падатку была для шляхты ВКЛ адносна невялікай — 16 грошай літоўскіх, г.зн. утрая менш за стаўку сярэбшчыны, зацверджанай у 1568 г. на сойме ў Гародні (48 грошай літоўскіх з валокі)[30].

У час абмеркавання ў пасольскай ізбе ўмоў выплаты падаткаў частка паслоў ВКЛ выступіла з праектам увядзення ў Княстве кварты. На нашу думку, гэта быў адзіны рэальны на той час варыянт павысіць абароназдольнасць краіны. Так, 4 жніўня паслы Віленскага ваяводства прапанавалі ўхваліць у ВКЛ спецыяльны падатак на тры гады на выкуп закладзеных гаспадарскіх уладанняў. З выкупленых такім чынам маёнткаў меркавалася ўвесці выплату ў скарб ¼ даходаў, якія б пайшлі на забеспячэнне замкаў[31]. Прапанова аб

увядзенні ў ВКЛ кварты, у цэлым, была ў інтарэсах павятовай шляхты, бо дазваляла ў будучым зменшыць той падатковы цяжар, які яна несла на патрэбы абароны. Акрамя таго, з'яўленне ў скарба крыніцы пастаянных даходаў спрыяльна адбілася б і на абароназдольнасці ВКЛ. З іншага боку, у бліжэйшай перспектыве новы падатак яшчэ больш абцяжарваў і так спустошаныя паборамі, баявымі дзеяннямі ды пастоямі жаўнераў шляхецкія маёнткі. Не будзем таксама забывацца, што ўвядзенне кварты непасрэдна закранала маёмасныя інтарэсы магнатэрыі, якая збольшага і была трымальнікам закладзеных даменіяльных уладанняў ды карысталіся ўсімі іх даходамі. Таму стаўленне паслоў ВКЛ да гэтага праекта аказалася неадназначным, і дыскусія была прыпыненая[32]. Аднак 8 жніўня частка велікакняжацкіх паслоў на чале з гаспадарскім маршалкам, навагарадскім земскім суддзёй Мальхерам Сноўскім прадставіла на абмеркаванне ніжняй палаты сойма падрыхтаваны ўжо ў пісьмовай форме праект ухвалення ў ВКЛ падатку для выкупу закладзеных гаспадарскіх уладанняў. На гэты раз прыхільнікі ўвядзення кварты спрабавалі дабіцца і падтрымкі з боку манарха. Аднак зноў прапанаваны праект сустрэў шмат праціўнікаў сярод паслоў як Кароны, так і Княства. Яны падкрэслівалі, што ідэя выкупу закладзеных уладанняў не абмяркоўвалася на сойміках ВКЛ, а значыць невядома была ступень яе грамадскай падтрымкі. Звярталі ўвагу, што ва ўмовах цяжкага гаспадарчага крызісу ўхваленне дадатковага падатку магло толькі выклікаць негатыўнае стаўленне шляхты ВКЛ да ўніі[33]. У выніку, не атрымаўшы шырокай падтрымкі, М.Сноўскі і яго аднадумцы былі вымушаны адмовіцца ад свайго праекта.

На Люблінскім сойме ў ліпені—жніўні 1569 г. разглядаліся таксама дыпламатычныя сродкі вырашэння канфлікту з вялікім князем маскоўскім Іванам IV. Мяркуем, што большасць сенатараў ВКЛ падтрымлівалі ідэю накіраваць у Маскву пасольства Рэчы Паспалітай і падпісаць перамір'е. Жыгімонт Аўгуст таксама схіляўся да правядзення перамоў з маскоўскім бокам. Яшчэ з лета 1568 г. манарх і ўладная эліта ВКЛ* распачалі кантакты з Іванам IV наконт магчымасці новых мірных перамоў[34]. Напэўна, Жыгімонт Аўгуст імкнуўся да нармалізацыі адносінаў з Іванам IV, каб забяспечыць спакойныя ўмовы для заключэння уніі паміж Каронай і Княствам, а эліта ВКЛ схілялася да перамір'я ў сувязі з надзвычай цяжкім фінансава-гаспадарчым становішчам краіны.

У ліпені 1569 г. Жыгімонтам Аўгустам і сенатарамі было прынята канчатковае рашэнне накіраваць "вялікае" пасольства Рэчы Паспалітай у Маскоўскую дзяржаву. Сенатары ад ВКЛ паспрабавалі дабіцца прызначэння "старшым" паслом вялікакняжацкага прадстаўніка, але дасягнуць гэтага не здолелі[35]. Такія захады павінны былі не толькі фармальна падкрэсліць асаблівую пазіцыю ВКЛ на ўсходнім накірунку ўжо супольнай знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай, але й рэальна захаваць яго вядучую ролю ў стасунках з Масквой, як тое было да заключэння уніі, а таксама забяспечыць уласныя інтарэсы ў адносінах са сваім найбольш небяспечным суседам. Аднак каронны бок не пагадзіўся на падобнае зніжэнне статусу сваіх прадстаўнікоў у агульных пасольствах новай дзяржавы. Ад Польшчы ў склад пасольства былі ўключаны іняўроцлаўскі ваявода Ян Кратоскі і радзяеўскі староста Рафал Ляшчыньскі, а ад ВКЛ — менскі кашталян Мікалай Тальваш і гаспадарскі сакратар, новагародскі падкаморы Андрэй Харытановіч-Абрынскі. У чэрвені 1570 г. "вялікае" пасольства Рэчы Паспалітай здолела заключыць з Вялікім Княствам Маскоўскім перамір'е на 3 гады на ўмовах *uti possidetis*, г.зн. дзяржавы захоўвалі за сабой тыя тэрыторыі, якімі валодалі на дадзены момант[36]. Адпраўку ў Маскву "вялікага" пасольства можна разглядаць як спробу атрымаць часовую перадышку ў вайне для аднаўлення ваеннаэканамічнага патэнцыялу краіны і назапашвання сіл для магчымага пачатку баявых дзеянняў. Увогуле, матэрыялы працы сойма адлюстроўваюць наяўнасць у палітычнага народа ВКЛ даволі рашучых настрояў адносна працягу вайны з Іванам IV, але вайны не абарончай, а менавіта наступальнай[37].

Прадстаўніцтва ВКЛ на сойме таксама засяродзілася на пытаннях кантролю за аптымальным зборам папярэдніх пабораў. Адказнасць за несвоечасовы і няпоўны збор грошай манарх і сенат перакладвалі на павятовую шляхту, а дакладней на павятовых пабарцаў. Былі прынятыя дзве соймавыя канстытуцыі, прысвечаныя праблеме кантролю за зборам падаткаў у Княстве[38]. У марудным зборы прызначаных соймам пабораў можна бачыць як нядбаласць часткі шляхты ў нясенні агульнадзяржаўных павіннасцяў, так і недахопы ў арганізацыі фіскальнага апарату Княства. Разам з тым, не трэба забываць, што актыўныя баявыя дзеянні, частыя падаткі, пастоі войскаў, неўраджаі прывялі ВКЛ да сур'ёзнага гаспадарчага крызісу[39], і насельніцтва ўжо проста не магло выплочваць у поўным аб'ёме ўсё новыя і новыя падаткі. Дададзім, што на сойме дэлегацыя ВКЛ закранала яшчэ цэлы шэраг спраў са сферы забеспячэння абароны, у тым ліку пытанні ўтрымання памежных замкаў, ўзаемаадносін мірнага насельніцтва з жаўнерамі, вызвалення шляхецкіх падданых ад прац па пабудове мастоў і замкаў ды інш.

---

*Да "ўладнай эліты" залічваем толькі тую частку палітычнай эліты, якая разам з вялікім князем літоўскім рэальна брала ўдзел у вызначэнні дзяржаўнай палітыкі і непасрэдна ўплывала на працэс прыняцця важнейшых рашэнняў па розных праблемах жыцця краіны. Для XVI ст. уладную эліту можна атаесамляць з такой палітычнай структурай, як т.зв. "парэдняя лавіца" паноў-рады ВКЛ ("пярэдняя рада").

### Вырашэнне мясцовых і персанальных спраў

Важна адзначыць, што дэлегацыя ВКЛ на пасяджэннях сойма ў Любліне закранала шырокае кола сацыяльна-эканамічных праблем лакальных шляхецкіх супольнасцяў. Так, разглядаўся шэраг спраў, звязаных з правядзеннем у Княстве аграрнай рэформы. Некаторыя шляхцічы хадайнічалі на сойме аб кампенсацыі за землі, аднятыя ў іх падчас валочнай памеры. Справа ў тым, што ў час аграрнай рэформы сярэдзіны XVI ст. адбывалася рэвізія правоў уласнасці на зямельныя ўладанні, а таксама далучэнне да дзяржаўных маёнткаў, за адпаведную кампенсацыю, некаторых прылеглых прыватнаўласніцкіх зямель. Даволі часта ў выніку гэтых мерапрыемстваў шляхта, асабліва дробная, пазбаўлялася сваіх уладанняў і далёка не заўсёды магла атрымаць справядлівую "замену"[40]. Таксама важнай праблемай быў прававы статус баяраў-шляхты, якія жылі ў прыватных маёнтках ці ва ўладаннях, што належалі асабіста вялікаму князю[41]. Абмяркоўвалася пытанне аб ураўнаванні гэтай катэгорыі шляхты ў правах з астатняй шляхтай ВКЛ, а таксама аб вызваленні яе з-пад васальнай залежнасці ад уладальнікаў маёнткаў ды з-пад юрысдыкцыі дзяржаўцаў і старостаў. Акрамя таго, разглядаліся праблемы арганізацыі мясцовага судаводства, размежавання розных рэгіёнаў паміж сабой. Асаблівае месца ў рэгіянальных пастулатах займала ваенная праблематыка, надзвычай актуальная для павятовай шляхты ва ўмовах Інфлянцкай вайны, у т.л. для штодзённага жыцця шляхты і яе падданых (напрыклад, канфлікты з ротмістрамі і жаўнерамі). Скардзілася яна і на свавольства мясцовай адміністрацыі.

Нарэшце, вальны сойм быў тым форумам, на якім шляхта магла вырашаць і свае персанальныя справы. Некаторыя з іх даюць важную інфармацыю аб сацыяльных адносінах у ВКЛ. Напрыклад, падчас сойма разглядалася справа пасла Вількамірскага павета Мікалая Кончы з віленскім ваяводам Мікалаем Радзівілам Рудым. М.Конча скардзіўся, што М.Радзівіл не даваў яму магчымасці ўвайсці ў трыманне сялом Вішунцы ў Віленскім павеце, нададзеным яму яшчэ са згоды Жыгімонта Аўгуста папярэднім віленскім ваяводам Мікалаем Радзівілам Чорным. Пасля атрымання ўрада віленскага ваяводы М.Радзівіл Руды "*не ведати для чого*" забраў Вішунцы пад сваю ўладу і не дазволіў М.Кончы ўзяць сяло ва ўладанне. На сойме на бок М.Кончы сталі некаторыя радныя паны, а таксама земскія паслы ВКЛ. У выніку, 14 жніўня 1569 г. Жыгімонт Аўгуст "*на жаданье Пановъ Рад н[а]шыхъ и прозбу пословъ земъскихъ, и на чоломъбитье того Конъчы*" выдаў спецыяльны ліст, у якім загадваў М.Радзівілу Рудому без усякіх затрымак перадаць сяло Вішунцы ва ўладанне М.Кончы[42]. Звернем увагу, што на сойме пры падтрымцы паслоў і некаторых сенатараў просты вількамірскі шляхціч здолеў выйграць справу ў аднаго з буйнейшых і ўплывовых магнатаў ВКЛ.

Таксама адзначым і салідарную пазіцыю прадстаўніцтва Кароны і Княства ў справе кампенсацыі стратаў пацярпелай ад маскоўскага нашэсця полацкай шляхце. Так, на адным з пасяджэнняў пасольскай ізбы выступілі "*высакародныя людзі*": полацкі шляхціч, дзяк канцылярыі ВКЛ Лукаш Гарабурда і азярышчанскі дзяржаўца, ротмістр Марцін Астравіцкі, якія толькі вярнуліся з маскоўскага палону. У сваёй прамове яны апісвалі ўсе яго цяжкасці. Шляхцічы асабліва падкрэслівалі, што іх не раз схілялі да пераходу на бок Івана IV, але ад здрады іх утрымалі дабрадзейнасць і вера, што з Божай дапамогай яны ўсё ж такі вырвуцца "*з рук лютага непрыяцеля*". Калі ж яны вызваліліся, то "*ніякай міласці*" ад гаспадара так і не атрымалі. Л.Гарабурда і М.Астравіцкі прасілі земскіх паслоў хадайнічаць перад Жыгімонтам Аўгустам аб кампенсацыі панесеных імі стратаў, каб мець магчымасць выкупіць з палону сваіх жонак і дзяцей. Сапраўды, усе земскія паслы Кароны і Княства праявілі карпаратыўную салідарнасць і прасілі караля надаць Л.Гарабурдзе ды М.Астравіцкаму слушнае матэрыяльнае забеспячэнне ў замен за іх маёмасць, захопленую або знішчаную ворагам[43]. Усе сенатары таксама падтрымалі просьбу шляхцічаў і "*у прычыне … жедали*", каб іх "*хлебокормъленьемъ пожаловали*". У выніку, Жыгімонт Аўгуст, улічыўшы матэрыяльныя страты Л.Гарабурды, яго вернасць гаспадару, а таксама просьбы сенатараў і паслоў, надаў яму, яго жонцы, дзецям і іх нашчадкам у трыманне 40 аселых валок "*кгрунъту доброго*" з усімі даходамі ў Жамойцкім старостве "*до очыщеня именей его в земли Полоцкой з рукъ непрыятельскихъ*" У сваю чаргу, М.Астравіцкі атрымаў ад гаспадара прывілей на трыманне "*до очыщеня*" 33 аселых валок у Вількамірскім павеце[44].

Сенатары і земскія паслы Рэчы Паспалітай хадайнічалі аб матэрыяльным забеспячэнні Яцка Быстрэйскага і братоў Сцяпана ды Есіфа Корсакаў, якія таксама трапілі ў маскоўскі палон пасля захопу Полацка і страцілі сваю маёмасць на акупаванай Полаччыне. І на гэты раз просьбы былі задаволеныя манархам[45].

Відавочна, што ініцыятарамі разгляду большасці лакальных спраў былі менавіта земскія паслы. Магчымасць паспяхова вырашаць свае персанальныя справы яшчэ больш умацоўвала стаўленне палітычнага народа ВКЛ да інстытута сойма не толькі як да месца вырашэння агульнадзяржаўных ці мясцовых праблем, але й да месца абароны прыватных правоў і вольнасцяў.

### Персанальны склад прадстаўніцтва ВКЛ на сойме люблінскім

Што датычыць персанальнага складу прадстаўніцтва ВКЛ на першым сойме Рэчы Паспалітай, то прааналізаваўшы яго з пункту гледжання трыманых сенатарамі і пасламі пасадаў, з улікам ступені іх сацыяльнай актыўнасці, этапаў кар'еры, сувязяў у шля-

хецкім асяроддзі, палітычнай і прававой культуры, сацыяльнага статусу, маёмаснага становішча, этнічнага паходжання і канфесійнай прыналежнасці. Падкрэслім, што паводле сацыяльнага статусу вышэйшае саслоўе ВКЛ XVI ст. можна падзяліць на тры асноўныя групы: князі, найперш, нашчадкі Гедымінавічаў і Рурыкавічаў; панскія роды; простая (нетытулаваная) шляхта[46]. Сацыяльны статус шляхты Княства трэба разглядаць у цеснай сувязі з іх маёмасным становішчам. Прыкладна ацаніць памер маёнткаў таго ці іншага шляхціча можна ў адпаведнасці з колькасцю выстаўленых ім на попіс войска ВКЛ узброеных вершнікаў (з кожных 10 сялянскіх "службаў" выстаўляўся адзін вершнік[47]). На нашу думку, да дробнай шляхты варта адносіць тых, хто выстаўляў у войска ад 1 да 4 вершнікаў, да сярэдняй шляхты — ад 5 да 24, да заможнай, буйной шляхты — ад 25 да 99, а да буйнейшай шляхты, магнатаў — тых, хто ставіў у войска 100 і больш вершнікаў[48]. Адзначым, што ВКЛ ад свайго пачатку было дзяржавай шматэтнічнай. Шматэтнічным быў і склад яго палітычнага народа[49]. Паколькі з-за адсутнасці адпаведных крыніц немагчыма вызначыць этнічную (сама)свядомасць кожнага канкрэтнага сенатара або пасла, то разглядаць будзем менавіта этнічнае паходжанне прадстаўнікоў ВКЛ.

На заключны этап Люблінскага сойма ў чэрвені 1569 г. у складзе дэлегацыі ВКЛ прыбылі 27 радных паноў, але ў якасці сенатараў Рэчы Паспалітай працягнуць працу змаглі толькі 15 асоб[50]. Сярод іх былі таксама смаленскія ваявода Васіль Тышкевіч і кашталян Рыгор Трызна[51], хаця Смаленскае ваяводства з пачатку XVI ст. знаходзілася ў складзе Маскоўскай дзяржавы. На нашу думку, утварэнне гэтых тытулярных урадаў, у першую чаргу, павінна было замацаваць далейшыя прэтэнзіі Рэчы Паспалітай на землі Смаленшчыны. На сойме адсутнічалі тыя сенатары ВКЛ, якія трымалі ўрады ваяводаў ці кашталянаў у памежных з Маскоўскай дзяржавай землях. Што было абумоўлена неабходнасцю кантраляваць сітуацыю на паўночна-ўсходніх межах, каб папярэдзіць агрэсіўныя дзеянні варожых войскаў. Па палітычных матывах на заключны этап Люблінскага сойма не вярнуўся толькі віленскі ваявода і канцлер М.Радзівіл Руды, хаця афіцыйна ён тлумачыў сваю адсутнасць у Любліне кепскім здароўем[52].

На сойме Княства было прадстаўлена сенатарамі, якія адносіліся да вышэйшай палітычнай эліты, мелі багаты досвед палітычнай, дыпламатычнай і вайсковай дзейнасці, а таксама трымалі ў сваіх руках важнейшыя земскія ўрады ды судовыя староствы. Яны мелі ўплыў і аўтарытэт як у манарха, так і сярод палітычнага народа ВКЛ. Вядучую ролю ў соймавай працы адыгрывала вузкая група ўладнай эліты, перш за ўсё, жамойцкі стараста, земскі маршалак Ян Хадкевіч, віленскі кашталян, вялікі гетман Рыгор Хадкевіч і троцкі кашталян, падканцлер Астафей Валовіч. З ліку "пярэдняй рады" ў Любліне не з'явіліся толькі першыя па іерархіі ўраднікі ВКЛ — віленскі біскуп Валерыян Пратасевіч і віленскі ваявода М.Радзівіл Руды. Безумоўным лідарам вялікакняжацкай дэлегацыі на сойме быў Я.Хадкевіч. Дададзім, што земскі падскарбі Мікалай Нарушэвіч актыўна ўдзельнічаў ва ўзгадненні нормаў новых пабораў у Княстве з нормамі Кароны і складанні канчатковага варыянта падатковага ўніверсала.

Фактычна ўсе сенатары ВКЛ, удзельнікі першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай, вызначаліся высокай ступенню сацыяльнай актыўнасці. Яшчэ да заключэння Люблінскай уніі бліскучую кар'еру зрабілі прадстаўнікі роду Хадкевічаў. Падтрымка манарха і папулярнасць сярод шляхты ператварылі Я.Хадкевіча ў палітычнага лідара ўсяго роду, а непасрэдны ўдзел у працы заключнага этапа сойма 1569 г. яшчэ больш павялічыў яго ўплыў у ВКЛ і пры гаспадарскім двары. У выніку прызначэнняў на вышэйшыя пасады і шчодрых наданняў, напярэдадні уніі гаспадару ўдалося ўраўнаважыць уплывы Радзівілаў і Хадкевічаў у Княстве[53]. У цэлым, Хадкевічы, у параўнанні з М.Радзівілам Рудым, былі больш схільнымі да кампрамісаў з Жыгімонтам Аўгустам і каронным бокам у пытанні заключэння уніі. Актыўная палітычная дзейнасць і набліжанае становішча да гаспадара абумовілі тое, што ў 1560-х гг. значную ролю ў ВКЛ стаў адыгрываць А.Валовіч. Ужо 20 чэрвеня 1569 г. ён быў прызначаны на адзін з вышэйшых дзяржаўных урадаў троцкага кашталяна[54]. Сапраўдным старажылам на палітычнай сцэне Княства з'яўляўся наваградскі ваявода Павел Сапега, які сваю кар'еру распачаў яшчэ пры каралі і вялікім князі Жыгімонце Старым. А вось Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка толькі распачынаў сваю палітычную дзейнасць: у чэрвені 1569 г. ён быў прызначаны Жыгімонтам Аўгустам на ўрад дворнага маршалка ВКЛ, калі яму яшчэ не споўнілася 20 гадоў[55]. Адзначым, што роды Хадкевічаў, Валовічаў і Тышкевічаў былі прадстаўлены на сойме двума асобамі кожны.

Звесткі аб грамадскай дзейнасці і палітычнай кар'еры сенатараў ВКЛ, якія ўдзельнічалі ў працы Люблінскага сойма, паказваюць, што значная іх колькасць была цесна звязана з каралеўскім дваром. Напрыклад, адразу для 6 сенатараў — А.Валовіча, В.Тышкевіча, берасцейскага ваяводы Юрыя Тышкевіча, Р.Трызны, кашталянаў наваградскага Рыгора Валовіча і берасцейскага Яна Гайкі — своеасаблівым "трамплінам" для далейшага палітычнага росту быў урад гаспадарскага маршалка, які даваў магчымасць манарху ўвесці ў склад паноў-рады прыбліжаных да сябе асобаў[56]. З такім інстытутам улады як канцылярыя, супрацоўнікі якой удзельнічалі ў рэалізацыі гаспадарскіх даручэнняў ва ўнутранай і знешняй палітыцы (а значыць, мелі адпаведны давер з боку гаспадара), былі звязаны кар'еры А.Валовіча[57], Я.Гайкі і М.Нарушэвіча. Не будзем забывацца, што жамойцкі

біскуп Юрый Пяткевіч з 1564 г. быў лекарам на двары Жыгімонта Аўгуста[58]. Да таго ж, сам Жыгімонт Аўгуст напярэдадні заключэння уніі спрабаваў перацягнуць на свой бок найбольш уплывовых палітыкаў ВКЛ. Так, з лета 1568 г. па май 1569 г. надзвычай выгодныя і шчодрыя маёмасныя ды грашовыя наданні атрымалі Р.Хадкевіч, троцкі ваявода Стэфан Збаражскі, А.Валовіч, Я.Хадкевіч, Р.Валовіч, М.Тальваш, М.Нарушэвіч і М.К.Радзівіл Сіротка[59]. Лічым, што менавіта Жыгімонт Аўгуст вызначальна паўплываў на палітычную пазіцыю велікакняжацкіх сенатараў на сойме ўлетку 1569 г. Нарэшце адзначым, што частку сенатараў, удзельнікаў першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай, можна аднесці і да інтэлектуальнай эліты Вялікага Княства. Універсітэцкую адукацыю мелі Ю.Пяткевіч, Я.Хадкевіч, П.Сапега, М.К.Радзівіл Сіротка і М.Нарушэвіч. П.Сапега і Р.Хадкевіч матэрыяльна падтрымлівалі праваслаўную царкву. Рыгор Хадкевіч зрабіў значны ўнёсак у развіццё кнігадрукавання ў ВКЛ[60].

Сенатарская частка прадстаўніцтва ВКЛ на сойме ў Любліне выразна адлюстроўвала сацыяльны, маёмасны, этнічны і канфесійны склад яго палітычнай эліты ў трэцяй чвэрці XVI ст. Гэта былі заможныя асобы з высокім сацыяльным статусам, даволі блізка звязаныя паміж сабой шлюбна-сваяцкімі сувязямі. Большая частка прысутных на сойме ў ліпені—жніўні 1569 г. сенатараў належала да панскіх родаў (9 асобаў): Р.Хадкевіч, А.Валовіч, Я.Хадкевіч[61], В.Тышкевіч, П.Сапега, Ю.Тышкевіч, менскі ваявода Гаўрыла Гарнастай, Р.Валовіч, М.Нарушэвіч. Да катэгорыі князёў па сваім паходжанні належаў толькі адзін сенатар ВКЛ — С.Збаражскі. Праўда, М.К.Радзівіл Сіротка меў ганаровы тытул князя Святой Рымскай Імперыі, які нясвіжская лінія Радзівілаў атрымала ад імператара Карла V у 1547 г.[62] З нетытулаванай шляхты паходзілі 4 сенатары ВКЛ: Ю.Пяткевіч, Р.Трызна, Я.Гайка і М.Тальваш.

Абсалютная большасць сенатараў ВКЛ, якія бралі ўдзел у першым сойме Рэчы Паспалітай, з’яўляліся магнатамі ці заможнымі шляхцічамі. Да першых адносілася 7 асобаў: Я.Хадкевіч, Р.Хадкевіч, А.Валовіч, С.Збаражскі, П.Сапега, М.Нарушэвіч, М.К.Радзівіл Сіротка, да другіх — 6 асобаў: В.Тышкевіч, Ю.Тышкевіч, Г.Гарнастай, Я.Гайка, Р.Валовіч, М.Тальваш. Нарэшце, толькі па адным сенатары ВКЛ адносілася да катэгорыі сярэдняй і дробнай шляхты: Р.Трызна і Ю.Пяткевіч адпаведна. Буйнейшым землеўладальнікам у дэлегацыі Княства быў М.К.Радзівіл Сіротка, які ў 1567 г. выставіў у войска 539 узброеных коннікаў і 386 пешых жаўнераў (драбаў)[63].

Сабраныя звесткі паказваюць, што абсалютная большасць прысутных у Любліне сенатараў ВКЛ (11 чалавек) належала да родаў усходнеславянскага паходжання. Так, да "рускіх" (беларускіх або ўкраінскіх) шляхецкіх родаў адносіліся Р.Хадкевіч, С.Збаражскі, А.Валовіч, Я.Хадкевіч, В.Тышкевіч, П.Сапега, Ю.Тышкевіч, Г.Гарнастай, Р.Трызна, Р.Валовіч, Я.Гайка. У сваю чаргу, да родаў балцкага (літоўскага) паходжання належалі астатнія 4 сенатары ВКЛ: Ю.Пяткевіч, М.Тальваш, М.Нарушэвіч і М.К.Радзівіл. У канфесійных адносінах сярод прысутных на сойме сенатараў пераважалі прадстаўнікі пратэстантаў. З 15 сенатараў ВКЛ 7 з’яўляліся кальвіністамі: А.Валовіч, Я.Хадкевіч, Г.Гарнастай, М.Нарушэвіч, С.Збаражскі, Я.Гайка, П.Сапега (магчыма). М.Тальваш быў лютэранінам[64]. Яшчэ пяць сенатараў мелі праваслаўнае веравызнанне: Р.Хадкевіч, В.Тышкевіча і яго сын Ю.Тышкевіч, Р.Трызна, Р.Валовіч. Каталікамі былі толькі два сенатары ВКЛ: Ю.Пяткевіч і М.К.Радзівіл Сіротка.

### Земскія паслы

Акт уніі 1 ліпеня 1569 г. падпісалі і замацавалі сваімі пячаткамі 42 земскія паслы ВКЛ[65]. У Любліне былі прадстаўлены амаль усе паветы і ваяводствы Княства. Не з’явіліся толькі паслы Браслаўскага і Упіцкага паветаў, а таксама Полацкага ваяводства. Хутчэй за ўсё, гэта было выклікана тым, што мясцовыя соймікі па нейкіх прычынах не ўхвалілі патрэбнага падатку для паслоў, што і стала прычынай іх адсутнасці ў Любліне[66]. Затое на сойме былі паслы Смаленскага ваяводства. Няма ніякіх сведчанняў, каб напярэдадні сойма адбыўся соймік, на якім сабралася б шляхта, так ці інакш звязаная са Смаленшчынай. Мяркуем, што два "смаленскія" паслы нікім не абіраліся і проста былі прызначаныя Жыгімонтам Аўгустам, а зацвярджэнне імі акта уніі давала магчымасць Рэчы Паспалітай прэтэндаваць на Смаленшчыну.

Персанальны склад земскага прадстаўніцтва на першым вальным сойме Рэчы Паспалітай досыць выразна адлюстраваў тагачасныя асаблівасці сацыяльнай, маёмаснай і этнаканфесійнай структуры шляхецкага саслоўя ВКЛ. Абсалютная большасць паслоў ВКЛ (35; 83,4%), абраных на павятовых сойміках у маі 1569 г., паходзіла з простай, нязнатнай шляхты. Гэта тлумачыцца тым, што да Люблінскай уніі вялікакняжацкая знаць мела іншыя шляхі ўваходжання ў склад палітычнай эліты дзяржавы. Таму выкананне функцыі сеймавага пасла было збольшага важным для нетытулаванай лакальнай эліты*. Сярод земскіх паслоў княжацкі тытул мелі толькі чатыры асобы (9,5%): Мальхер і Каспар Гедройцы, Ян Свірскі, Іван Масальскі.

* Да "лакальнай палітычнай эліты" адносім групу людзей, якія валодалі рэальнай уладай і аўтарытэтам у павеце, актыўна ўдзельнічалі ў грамадска-палітычным жыцці, у т.л. у вырашэнні мясцовых праблем, як на лакальным, так і на дзяржаўным узроўні. Гэта былі павятовыя ўраднікі, члены земскага і гродскага суда, актывісты, якія ўдзельнічалі ў працы соймікаў, абіраліся пасламі на соймы і з’езды (пазней — яшчэ і дэпутатамі Трыбунала ВКЛ), прызначаліся мясцовымі паборцамі.

Паводле маёмаснага становішча, большасць паслоў з паветаў і ваяводстваў ВКЛ (мінімум 19; 45,2%) належала да дробнай шляхты, даволі значную іх частку (мінімум 11; 26,2%) можна аднесці да сярэдняй шляхты. Толькі двух шляхцічаў (4,8%) можам залічыць да катэгорыі заможнай шляхты. Так, пасол Жамойцкага старосства Мікалай Станкевіч-Білевіч у 1567 г. ставіў у войска 27 коннікаў і 13 драбаў. А самым заможным сярод земскіх паслоў ВКЛ на Люблінскім сойме ўлетку 1569 г. быў пасол Навагародскага павета М.Сноўскі. Ён паводле попісу 1567 г. са сваіх маёнткаў выставіў у войска 48 вершнікаў і 28 драбаў, з якіх 16 вершнікаў і 12 драбаў былі выстаўлены звыш павіннасці[67]. Мы не маем канкрэтных дадзеных аб маёмасным становішчы астатніх 10 земскіх паслоў (23,8%). Аднак наўрад ці нехта з іх мог належаць да заможнай ці нават сярэдняй шляхты. Хутчэй за ўсё, гэта былі прадстаўнікі дробнай, у крайнім выпадку, сярэдняй шляхты. Таму з вялікай доляй верагоднаці можна павялічыць долю дробнай шляхты ў земскім прадстаўніцтве ВКЛ на сойме ўлетку 1569 г. нават да 69%. Падкрэслім таксама адсутнасць сярод паслоў Княства прадстаўнікоў магнатэрыі.

Паводле свайго этнічнага паходжання земскае прадстаўніцтва ВКЛ на першым сойме Рэчы Паспалітай падзялялася на дзве фактычна аднолькавыя буйныя групы: шляхту ўсходнеславянскага і балцкага паходжання. Да ўсходнеславянскіх родаў можна аднесці 17 (40,5%) соймавых паслоў, якія паходзілі з этнічна беларускіх паветаў ВКЛ, а таксама з украінскіх зямель. Да балцкіх родаў — таксама 17 (40,5%). Балцкае паходжанне мелі выхадцы з этнічна літоўскіх паветаў (Вількамірскі, Ковенскі, Упіцкі) і Жамойці. Значную долю сярод паслоў складалі шляхцічы з польскімі этнічнымі каранямі. Да родаў польскага паходжання адносім 6 (14,3%) земскіх паслоў ВКЛ. Яшчэ два паслы (4,8%) мелі іншае этнічнае паходжанне. Так, прадстаўнік Мазырскага павета Фёдар Лянкевіч-Іпагорскі належаў да армянскага роду, які ў XVI ст. асеў на Мазыршчыне, а мсціслаўскі пасол Ісай Шчалкановіч магчыма меў татарскае паходжанне[68]. На жаль, з-за абмежаванасці крыніц немагчыма правесці аналіз канфесійнай прыналежнасці земскіх прадстаўнікоў ВКЛ. Аднак вядома, што ў 1569 г. сярод іх былі і праваслаўныя, і пратэстанты, і каталікі. Гэта сведчыць аб тым, што на той час канфесійная прыналежнасць, як і этнічнае паходжанне, не адыгрывалі рашаючай ролі ў палітычнай дзейнасці шляхты. Сацыяльная і прававая еднасць палітычнага народа ВКЛ была куды важней за яго этнаканфесійную стракатасць. Таксама варта падкрэсліць, што абсалютная большасць земскіх паслоў паходзіла з мясцовых шляхецкіх родаў, аселых у сваіх рэгіёнах як мінімум у другім пакаленні. І менавіта гэта, на наш погляд, у большай ступені ўплывала на пазіцыю шляхты пры выбары сваіх соймавых прадстаўнікоў.

Большасць земскіх паслоў ВКЛ з'яўлялася павятовымі ўраднікамі (22 паслы, 52,4%). Асабліва адзначым вялікую долю асобаў, у той ці іншай ступені звязаных з працай судоў. У якасці паслоў было абрана 9 (21,4% ад усіх паслоў ці 40,9% ад усіх павятовых ураднікаў) ураднікаў земскіх судоў. Безумоўна, гэтыя асобы мусілі быць добра абазнанымі ў тагачасным заканадаўстве і судаводстве. Частка паслоў выконвала іншыя судовыя функцыі, мела папярэдні вопыт судовай дзейнасці, працавала над кадыфікацыяй права ВКЛ. Гэтыя дадзеныя дазваляюць меркаваць аб даволі высокім узроўні прававой культуры земскіх паслоў Княства на Люблінскім сойме. Не будзем забываць, што пасады ў земскіх судах былі выбарнымі, г.зн. асобы, якія іх займалі, мусілі мець сур'ёзны аўтарытэт у асяроддзі павятовай шляхты. Другую групу сярод паслоў складалі асобы без пасадаў, якіх было 18 (42,9%) чалавек. Нарэшце, 5 земскіх паслоў (11,9%) адносіліся да дворных ураднікаў.

Атрыманыя звесткі паказваюць, што амаль дзве трэці паслоў з рэгіёнаў ВКЛ актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці як на лакальным, так і агульнадзяржаўным узроўні: займалі павятовыя ўрады, абіраліся соймавымі пасламі і зборшчыкамі падаткаў, мелі вопыт баявой і дыпламатычнай дзейнасці. Адносна шмат было асобаў уплывовых у шляхецкім асяроддзі, з даволі высокім узроўнем палітычнай культуры. Найбольш выразна ў ролі лідараў земскага прадстаўніцтва праявілі сябе на сойме М.Сноўскі і М.Станкевіч-Білевіч. Пасол Навагрудскага павета М.Сноўскі не раз выступаў ад імя ўсіх земскіх паслоў ВКЛ, быў адным з ініцыятараў і, верагодна, аўтараў праекта выплаты кварты з дзяржаўных маёнткаў на патрэбы абароны. Гэты праект падтрымаў і жамойцкі пасол М.Станкевіч-Білевіч, які таксама актыўна выступаў супраць памеры зямельных уладанняў бяднейшай шляхты, у выніку чаго "ўбогая" шляхта магла пазбавіцца не толькі сваіх уладанняў, але й нават свайго шляхецкага статусу[69]. Між іншым, яшчэ 29 чэрвеня 1569 г. абодва паслы бралі ўдзел у канчатковым узгадненні тэксту унійнага прывілея[70]. Дзейнасць на сойме 1569 г. М.Сноўскага і М.Станкевіча-Білевіча, накіраваная на абарону інтарэсаў сярэдняга і дробнага шляхецтва, дазваляе назваць іх палітычнымі лідарамі самастойнага шляхецкага руху, які нараджаўся ў гэты час у ВКЛ. Падаецца невыпадковым, што абодва самыя заўважныя ў Любліне парламентары Княства належалі менавіта да заможнай шляхты. Эканамічная незалежнасць і ўплывовая пратэкцыя[71] дазволілі М.Сноўскаму і М.Станкевічу-Білевічу займаць на сойме больш незалежную палітычную пазіцыю.

Разам з тым, многія паслы былі кліентамі магнатаў, што абмяжоўвала іх самастойнасць у прыняцці рашэнняў. Сярод іх сустракаецца група шляхцічаў, якія ў той ці іншай ступені былі звязаны з двума вядучымі магнацкімі родамі ВКЛ: Радзівіламі і Хадкеві-

чамі. Частка земскіх паслоў мела кліентальныя сувязі з А.Валовічам. Падкрэслім, што ў тагачасным шляхецкім грамадстве ВКЛ існавала шматузроўневая сістэма пратэкцыяніцкіх і суседска-сваяцкіх сувязяў. І кожны шляхціч, які імкнуўся зрабіць добрую кар'еру і актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, мусіў шукаць падтрымкі ў розных палітычных сіл, лавіраваць паміж інтарэсамі магнацкіх родаў і гаспадарскага двара. Выразным прыкладам такіх паводзін могуць быць сувязі пасла Гарадзенскага павета Яна Клюкоўкага. Яго бацька быў кліентам М.Радзівіла Рудога, ён сам з канца 1550-х гг. служыў пры каралеўскім двары, а ў 1568 г. узяў шлюб з Паланеяй з Валовічаў — стрыечнай сястрой А.Валовіча[72].

Тым не менш, вызначальны ўплыў на дзейнасць паслоў ВКЛ на сойме меў Жыгімонт Аўгуст. Сабраныя звесткі паказваюць, што як мінімум 24 паслы (57,1%) былі даволі цесна звязаны з яго дваром, з'яўляліся гаспадарскімі дваранамі, прыцягваліся да выканання разнастайных даручэнняў манарха. Выкажам меркаванне аб значным уплыве двара на фарміраванне складу земскага прадстаўніцтва ВКЛ і, безумоўна, на яго дзейнасць на сойме. На нашу думку, Жыгімонт Аўгуст здолеў забяспечыць выбар на павятовых сойміках у маі 1569 г. значнай колькасці лаяльных да яго паслоў і збольшага мог кантраляваць працу паслоў Княства на сойме ў Любліне.

І пасля 1569 г. амаль палова з разглядаемых соймавых паслоў ВКЛ працягвала весці актыўную грамадска-палітычную дзейнасць. Фактычна трэць здолелі дабіцца кар'ернага росту, галоўным чынам на павятовым узроўні. Аднак толькі чатыры затым сталі сенатарамі Рэчы Паспалітай. Першым гэтай годнасці дасягнуў Дамінік Пац, які ўжо ў 1572 г. быў прызначаны смаленскім кашталянам[73]. З 1576 па 1609 г. жамойцкім біскупам з'яўляўся М.Гедройц, а М.Сноўскі з 1579 па 1587 г. трымаў урад віцебскага кашталяна[74]. Адам Пацей зрабіў не толькі свецкую, але й значную духоўную кар'еру. Так, у 1588 г. ён стаў берасцейскім кашталянам, але ўжо ў 1593 г. перайшоў у духоўны стан і пад імём Іпацій узначаліў праваслаўнае Уладзіміра-Берасцейскае епіскапства. А ў 1599 г. ён стаў кіеўскім мітрапалітам і ўзначаліў ужо ўніяцкую царкву Рэчы Паспалітай[75].

***

Такім чынам, улетку 1569 г. дэлегацыя Вялікага Княства Літоўскага вярнулася на сойм у Люблін дзеля вырашэння дзвюх галоўных задач: заключэння уніі з Польскім Каралеўствам і арганізацыі сумеснай абароны. Аднак важнейшай мэтай, якая стаяла перад раднымі панамі і земскімі пасламі, было максімальна забяспечыць захаванне правоў і вольнасцяў Княства, дамагчыся яго роўнага статусу з Каронай у межах Рэчы Паспалітай. Шэраг рашэнняў, ухваленых на сойме, дазваляюць гаварыць аб тым, што прынамсі фармальна вялікакняжацкая дэлегацыя дабілася замацавання раўнапраўнага статусу ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Разам з тым, значныя тэрытарыяльныя страты, перанос цэнтра палітычнага жыцця на землі Кароны не даюць магчымасці назваць дзейнасць прадстаўнікоў ВКЛ у Любліне цалкам паспяховай. Тым не менш, сойм не здолеў вырашыць усіх прынцыпова важных для далейшага развіцця новай дзяржавы праблем, што ў далейшым адкрывала шлях або да поўнага зліцця Польшчы і ВКЛ у "*адзінае непадзельнае і неадрознае цела*", або да захавання ў складзе Рэчы Паспалітай дзяржаўнасці і частковага суверэнітэту ВКЛ. У цэлым, сенатары і паслы Княства вызначаліся высокай ступенню сацыяльнай актыўнасці, мелі даволі высокі ўзровень палітычнай і прававой культуры. Аднак ход соймавай працы стварае ўражанне пэўнай пасіўнасці дэлегацыі ВКЛ, адсутнасці прынцыпова новых ідэй па найбольш важных пытаннях грамадскага жыцця дзяржавы. З аднаго боку, гэта можа тлумачыцца залежнасцю большасці сенатараў і земскіх паслоў Княства ад Жыгімонта Аўгуста. З другога боку, магчыма, яго палітычны народ на той час быў разгублены пасля вельмі радыкальных і рашучых крокаў манарха, а таксама каронная шляхты, звязаных з далучэннем некаторых зямель ВКЛ да Польшчы і канчатковым заключэннем уніі. Палітычная ініцыятыва на Люблінскім сойме ў ліпені—жніўні 1569 г. безумоўна належала Жыгімонту Аўгусту і каронным сенатарам ды паслам.

[1] Такі характар Люблінскага сойма ў ліпені—жніўні 1569 г. ужо адзначаўся ў гістарычнай навуцы: Лаппо И.И. Великое княжество Литовское от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569—1586). Т. 1. Санкт-Петербург, 1901. С. 73; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy (Stosunki polsko-litewskie w latach 1569—1588). Warszawa, 2002. S. 41.

[2] Падрабязней гістарыяграфію вывучаемай праблематыкі, а таксама крыніцавую базу даследавання гл. у: Падалінскі У.А. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. Мінск, 2017. С. 5—15.

[3] Akta unii Polski z Litwą 1385—1791. Kraków, 1932. S. 373—375; Historia sejmu polskiego: W 3 t. T. 1. Warszawa, 1984. S. 170—171, 174—175; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 23, 43 Volumina Constitutionum (далей — VC). T. II (1550—1609), vol. 1. Warszawa, 2005. S. 236, 239—241, 243—244, 246, 262.

[4] Historia sejmu polskiego. T. 1. S. 192—200; Sucheni-Grabowska A. W sprawie podejmowania uchwał na sejmach za Zygmunta Augusta // Uchwalanie konstytucji na sejmach w XVI—XVIII w. / Acta Universitatis Wratislaviensis. Nr. 477. Historia XXXI. Studia z dziejów Rzeczypospolitej szlacheckiej. Wrocław, 1979. S. 9—19; Zakrzewski A. Wielkie Księstwo Litewskie (XVI—XVIII w.). Prawo—ustrój—społeczeństwo. Warszawa, 2013. S. 95.

[5] Любавский М.К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и

внешнею жизнью государства. Москва, 1900. С. 840—841; Rachuba A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569—1763. Warszawa, 2002. S. 49—50, 168—169.

[6] VC. T. II, vol. 1. S. 235—237.

[7] Тэкст прывілея гл. напр.: Akta unii Polski z Litwą 1385—1791. S. 376—378.

[8] Akta unii Polski z Litwą 1385—1791. S. 385—386, 390—392. Гл. таксама: Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S . 47—51; Seredyka J. Konflikty marszałków koronnych z litewskimi od Unii Lubelskiej do połowy XVII wieku // Świat pogranicza. Warszawa, 2003. S. 213—220; Wisner H. Unia Lubelska i III Statut Litewski z roku 1588 // Zapiski Historyczne. T. 51. Z. 1. 1986. S. 36—37.

[9] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной России, издаваемый при управлении Виленского учебного округа: В 14 т. Т. 7). Вильна, 1870. С. 45; Akta unii Polski z Litwą 1385—1791. S. 179—180, 220—227; VC. T. II, vol. 1. S. 127—128.

[10] Дневник Люблинского сейма 1569 года: Соединение Великого Княжества Литовского с Королевством Польским. Санкт-Петербург, 1869. С. 478—480, 481—483; Źródłopiśma do dziejów unii Korony Polskiej i Wielkiego Księstwa Litewskiego. Cz. III. Diariusz sejmu lubelskiego. Rok 1569. Poznań, 1856. S. 186—188.

[11] Akta unii Polski z Litwą 1385—1791. S. 378—380. Гл. таксама: Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 42.

[12] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 528, 529—530; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 212—213.

[13] Русская историческая библиотека (далей — РИБ): В 39 т. Т. 30: Литовская Метрика. Отдел первый—второй. Ч. 3: Книги публичных дел. Юрьев, 1914. Стб. 466—468.

[14] VC. T. II, vol. 1. S. 254—255.

[15] Падалінскі У. Партыкулярызм *vs* уніфікацыя: распрацоўка і прыняцце Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. // Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя. № 2. 2018. С. 10—20.

[16] Гл. напр.: Małłek J. Prusy Książęce a Polska i Litwa w latach 1525—1701 // Rzeczpospolita w XVI—XVIII wieku. Państwo czy wspólnota? Toruń, 2007. S. 169.

[17] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 487, 492, 495, 498—500, 531—534, 590, 598—599; VC. T. II, vol. 1. S. 156—158; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 200—204, 213 — 214, 235, 240—241.

[18] VC. T. II, vol. 1. S. 246.

[19] Bues A. Włączenie Księstwa Kurlandii i Semigalii do Rzeczypospolitej polsko-litewskiej w czasach Unii Lubelskiej // Праблемы інтэграцыі і інкарпарацыі ў развіцці Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў перыяд ранняга Новага часу: Матэрыялы міжнар. навук. канферэнцыі. Мінск, 2010. С. 94—105; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 52; Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 244—245.

[20] VC. T. II (1550—1609), vol. 2 (1587—1609). Warszawa, 2008. S. 100—103. Гл.таксама: Падалінскі У. Праблема статусу Інфлянтаў у дачыненнях палітычных элітаў ВКЛ і Польшчы (1582—1586 гг.) // Acta Albaruthenica. Warszawa, 2007. S. 356—365; Dybaś B. Terytoria inflanckie w ramach Rzeczypospolitej (1561—1795) // Rzeczpospolita w XVI—XVIII wieku. S. 179—192; Tarvel E. Stosunek prawnopaństwowy Inflant do Rzeczypospolitej oraz ich ustrój administracyjny w l. 1561—1621 // Zapiski Historyczne. T. 34. Z. 1. 1969. S. 49—77.

[21] РИБ. Т. 30. Стб. 522.

[22] Akta unii Polski z Litwą 1385—1791. S. 381; VC. T. II, vol. 1. S. 243, 245—246. Гл. таксама: Halecki O. Dzieje unii jagiellońskiej. S. 348; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 42.

[23] Akta unii Polski z Litwą 1385—1791. S. 308—319, 348—362; VC. T. II, vol. 1. S. 226—232, 255. Гл. таксама: Litwin H. Równi do równych: kijowska reprezentacja sejmowa 1569—1648. Warszawa, 2009. S. 14.

[24] Усебаковы аналіз удзелу ВКЛ у Інфлянцкай вайне ў перыяд 1558—1570 гг. гл. у: Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558—1570 гг. Мінск, 2007.

[25] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 496—499, 593, 608—612; VC. T. II, vol. 1. S. 256; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 203—204, 236—237, 245—249.

[26] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 492—500, 534, 601; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 201—205, 214—215, 242.

[27] Гл. напр.: Доўнар-Запольскі М.В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах. Мінск, 2009. С. 602—606.

[28] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 585, 603—604; Доўнар-Запольскі М.В. Дзяржаўная гаспадарка… С. 388—393, 416—419; Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 626—628, 648—649, 795; РИБ. Т. 30. Стб. 396—400, 461—463; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 233, 242—243.

[29] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 605, 607—609; VC. T. II, vol. 1. S. 256—261; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 245—248.

[30] РИБ. Т. 30. Стб. 442—444.

[31] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 609; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 246.

[32] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 609; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 246—247. Аб масавай заставе дзяржаўных маёнткаў магнатам і шляхце ВКЛ у 1560-я гг. гл. напр.: Доўнар-Запольскі М.В. Дзяржаўная гаспадарка… С. 196—201; Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна… С. 241—242.

[33] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 617—619; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 251—252.

[34] Книга посольская Метрики Великого княжества Литовского: В 2 т. Т. 1. Москва, 1843. С. 272—283; Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна… С. 110—111.

[35] Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie (далей — AGAD). Archiwum Radziwiłłów (далей — AR). Dz. V. Nr. 17959/I. S. 106.

[36] Книга посольская… Т. 1. С. 284, 290—301; Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна… С. 112—117; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 45—47.

[37] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 496, 498—499, 608—609; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 203—204, 246.

[38] Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика (далей — LM). Kn. 532. P. 62—64, 83—84; VC. T. II, vol. 1. S. 255. Гл. таксама: Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна… С. 227—228.

[39] Вынікам крызісу стаў голад, які ахапіў ВКЛ у 1569—1572 гг. Маштабы яго былі настолькі значныя, што сталі шырока вядомы па ўсёй тагачаснай Еўропе: Pirożyński J. Z dziejów obiegu informacji w Europie XVI wieku. Nowiny z Polski w kolekcji Jana Jakuba Wicka w Zürychu z lat 1560—1587. Kraków, 1995. S. 277, 290.

[40] Падрабязней гл.: Падалінскі У.А. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года. С. 108—111.

[41] Гл. напр.: Sienkiewicz W. Bojarzy—szlachta i ziemianie w dobrach prywatnych w Wielkim Księstwie Litewskim w pierwszej połowie XVI wieku // Zapiski Historyczne. T. 48. Z. 4. 1983. S. 31—65.

[42] LM. Kn. 532: 1569—1571. Vilnius, 2001. P. 77—78.

[43] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 626—627; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 254. Гл. таксама: Mienicki R. Egzulanci Połłoccy (1563—1580) // Ateneum Wileńskie. Rok. IX. Wilno, 1933—1934. S. 100—101.

[44] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). КМФ-18, воп. 1, спр. 50, арк. 339—340; LM. Kn. 532. P. 76—77.

[45] НГАБ. КМФ-18, воп. 1, спр. 50, арк. 313—313адв., Спр. 267, арк. 269адв.—271; LM. Kn. 49: 1566—1572. Vilnius, 2014. P. 57—58; Kn. 532. P. 77.

[46] Пра маёмасны і сацыяльны падзел шляхецкага стану ВКЛ у сярэдзіне XVI ст. гл. напр.: Лаппо И.И. Великое княжество Литовское от заключения Люблинской унии… С. 255—266; Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI—першай трэці XVII ст. Мінск, 2002. С. 11—14; Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego w Wielkim Księstwie Litewskim późnego średniowiecza // Zapiski Historyczne. T. 48. Z. 1—2. 1983. S. 34—66.

[47] Любавский М.К. Литовско-русский сейм. С. 759—762.

[48] Падалінскі У.А. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года. С. 150—153. Падкрэслім, што тэрмін "магнат" ужываецца выключна для абазначэння буйнейшых землеўладальнікаў.

[49] Гл. напр.: Грицкевич А.П. Распределение магнатских и шляхетских владений в Белоруссии по их величине и этнической принадлежности владельцев (XVI в.) // Вопросы истории. Вып. 5. Минск, 1978. С. 94—105; Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель… С. 22—24; Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego… S. 73—75.

[50] Падалінскі У.А. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года. С. 126—129.

[51] Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy. T. 4: Ziemia smoleńska i województwo smoleńskie XIV—XVIII wiek. Warszawa, 2003. S. 86, 214.

[52] AGAD. AR, dz. V, nr. 13980, s. 52; Ferenc M. Mikołaj Radziwiłł "Rudy" (ok. 1515—1584). Działalność polityczna i wojskowa. Kraków, 2008. S. 344—347; Listy króla Zygmunta Augusta do Radziwiłłów. Kraków, 1999. S. 564.

[53] Янушкевіч А.М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна… С. 283—286; Kempa T. Rywalizacja Radziwiłłów i Chodkiewiczów o pierwsze miejsce w elicie politycznej Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 60. i 70. XVI wieku // History, culture and language of Lithuania. Proceedings of the international Lithuanian conference. Poznań, 2000. S. 196—198, 202.

[54] LM. Kn. 530: 1566—1572. Vilnius, 1999. P. 74—75; Wolff J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego (1386—1795). Kraków, 1885.S. 64.

[55] LM. Kn. 530. P. 75—77; Lulewicz H. Sapieha (Sopieha) Paweł na Kodniu h. Lis (zm. 1579) // Polski Słownik Biograficzny (далей — PSB). T. XXXV/1, z. 144. Warszawa-Kraków, 1994. S. 128—131; Wolff J. Senatorowie i dygnitarze… S. 179.

[56] Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 339.

[57] Падкрэслім, што пры гэтым А.Валовіч даволі ўдала лавіраваў паміж самымі ўплывовымі ў ВКЛ магнацкімі родамі. Так, ён называў сябе прыяцелем і "слугой", як Хадкевічаў, так і Радзівілаў: AGAD. AR, dz. V, nr. 17959/I, s. 137; Archiwum książąt Sanguszków w Sławucie. T. 7: 1554—1572. Lwów, 1910. S. 235—236.

[58] Błaszczyk G. Diecezja żmudzka od XV w. do początku XVII w. Ustrój / Uniwersytet im. Adama Mickiewicza w Poznaniu. Seria historia, nr. 180. Poznań, 1993. S. 67—68; Ferenc M. Dwór Zygmunta Augusta. Organizacja i ludzie. Oświęcim, 2014. S. 116, 162, 277.

[59] НГАБ. КМФ-18, воп. 1, спр. 50, арк. 198—199, 220адв.—222, 222—223, 227адв.—231адв., 231адв.—236, 246—248адв., 289адв.—290, 292—292адв., 293, 316адв.—320, 328; Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł "Sierotka" (1549—1616) wojewoda wileński. Warszawa, 2000. S. 51; LM. Kn. 51: 1566—1574. Vilnius, 2000. P. 241—242; Kn. 52 (1569—1570). Vilnius, 2004. P. 26—29; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 28—29.

[60] Jasnowski J. Chodkiewicz Grzegorz (Hrehory) h. Gryf z miecz. // PSB. T. III. Kraków, 1937. S. 359; Lulewicz H. Sapieha (Sopieha) Paweł na Kodniu… S. 130.

[61] Акрамя таго, у 1555 г. тагачасны троцкі кашталян і жамойцкі староста Еранім Хадкевіч атрымаў ад імператара Святой Рымскай Імперыі Карла V тытул графа на Шклове і Мышы. З гэтага часу графскім тытулам карысталіся ён і яго нашчадкі, у т.л. яго сын Я.Хадкевіч: Кіркене Г. Новы погляд на род Хадкевічаў — графаў на Шклове і Мышы // ARCHE. 2014. № 6. С. 62; Малиновский И. Сборник материалов, относящихся к истории панов-рад Великого княжества Литовского. Томск, 1901. С. 78—81.

[62] Гл. напр.: Poczet rodów w Wielkim Księstwie Litewskim w XV i XVI wieku. Warszawa, 1887. S. 276; Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego… S. 38, 66. Першапачаткова род Радзівілаў адносіўся да "паноў".

[63] РИБ. Т. 33: Литовская Метрика. Отдел третий. Ч. 3: Книги публичных дел. Переписи Литовского войска. Петроград, 1915. Стб. 453.

[64] Lulewicz H. Skład wyznaniowy senatorów świeckich Wielkiego Ksiestwa Litewskiego za panowania Wazów // Przegląd Historyczny. 1977. T. 68. Z. 3. S. 428, 429, 431.

[65] Akta unii Polski z Litwą 1385—1791. S. 348—356.

[66] Падалінскі У.А. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года. С. 28—29, 164.

[67] РИБ. Т. 33. Стб. 463, 1258.

[68] Poczet rodów... S. 343; Szczygielski W. Lenkewicz Adam h. Kotwicz (ok. 1710—1782) // PSB. T. 17. Wrocław etc., 1972. S. 54.

[69] Дневник Люблинского сейма 1569 года. С. 569—570, 602—603, 609, 617—619; Źródłopiśma do dziejów unii. S. 226—227, 242, 246—247, 251—252.

[70] Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 30.

[71] М.Сноўскі карыстаўся даволі выразнай падтрымкай Жыгімонта Аўгуста, а М.Станкевіч-Білевіч — Я.Хадкевіча, які на той час актыўна карыстаўся лозунгамі "шляхецкай дэмакратыі": НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 39. Арк. 618—618адв., 623—623адв. (інфармацыя А.Радамана); Спр. 50, арк. 197—197адв., 204—206, 270—272; Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кн. 46. (1562—1565). Мінск, 2006. С. 158—161. Гл. таксама: Radaman A. Samorząd sejmikowy w powiatach województwa nowogródzkiego Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1565—1632 // Praktyka życia publicznego w Rzeczypospolitej Obojga Narodów w XVI—XVIII wieku. Warszawa, 2010. S. 79, 97—98.

[72] Ferenc M. Dwór Zygmunta Augusta. S. 264; Ragauskienė R. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės kancleris Mikalojus Radvila Rudasis (Apie 1515—1584 m.). Vilnius, 2002. P. 337—339; Unus pro omnibus: Валовічы ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага XV—XVIII стст. Мінск, 2014. С. 79, 317.

[73] Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy. T. 4. S. 87.

[74] Herbst S. Giedroyć Melchior (ok. 1536—1608) // PSB. T. 7. Kraków, 1948—1958. S. 430—431; Lulewicz H. Snowski Malcher (Melchior) h. Dołęga (zm. 1587) // PSB. T. 39/3. Z. 162. Warszawa—Kraków, 1999. S. 408—410.

[75] Kempa T. Metropolita kijowski Hipacy Pociej w świetle swojej korespondencji // Epistolografia w dawnej Rzeczypospolitej. T. I (stulecia XV—XVII). Kraków, 2011. S. 141—171.